# ДЗЯРЖАЎНЫЯ КЛУБНЫЯ ЎСТАНОВЫ НА МЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ: СТАН І КІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ

*А. А. Макарава*

Сацыяльна-культурныя працэсы пачатку 1990-х гг. аказалі вырашальны ўплыў на вызначэнне месца клубнай установы ў грамадстве, прывялі да прынцыпова новага разумення сацыяльнага прызначэння ўсёй клубнай дзейнасці. Менавіта ў пачатку 1990-х гг. выявіліся значныя праблемы ў сістэме функцыянавання клубных устаноў, звязаныя з іх адаптацыяй да новых сацыяльна-палітычных і эканамічных умоў. Пытанні аб далейшым развіцці ў Беларусі клубных устаноў актуалізавалі пошук навукова-абгрунтаваных тэарэтычных падыходаў да кіравання рознымі сацыяльна-культурнымі працэсамі, якія ажыццяўляюцца непасрэдна праз дзейнасць клубнай установы. Час патрабаваў перагляду прававога, эканамічнага, арганізацыйна-творчага забеспячэння клубнай установы як аднаго з інстытутаў, якія рэгулююць сацыяльна-культурную актыўнасць насельніцтва ва ўмовах вольнага часу і якія ўплываюць на развіццё нацыянальнай культуры.

Наяўнасць крызісных фактараў праявілася перш за ўсё ў адсутнасці стратэгіі перспектыўнага развіцця галіны і недасканаласці нарматыўнай прававой базы, негатоўнасці да колькасных і якасных пераўтварэнняў сеткі ўстаноў культуры ў цэлым. Нягледзячы на тое, што сутнасць дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мастацтва, народнай творчасці і ў сферы вольнага часу ў цэлым была вызначана шэрагам заканадаўчых актаў (у прыватнасці, асобнымі артыкуламі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законамі «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб грамадскіх арганізацыях у Рэспубліцы Беларусь» і інш.), якія забяспечылі дастаткова высокую ступень свабоды культурна-творчай дзейнасці грамадзян і спрыялі наваўвядзенням і сацыяльна-арганізацыйнаму эксперыментаванню, адсутнасць дакладна вызначанай пазіцыі дзяржавы ў адносінах да клубнай дзейнасці прывяла да неабгрунтаванага ў некаторых выпадках скарачэння сеткі і штатных адзінак клубных устаноў.

Сярод асноўных прычын гэтага працэсу можна назваць нерэнтабельнасць утрымання сельскіх клубаў у маланаселеных вёсках, адсутнасць неабходных фінансавых сродкаў на ўтрыманне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстаноў і, адначасова, недахоп кваліфікаваных спецыялістаў, немагчымасць эксплуатацыі аварыйных будынкаў і інш.

Прагнозы ў дачыненні да развіцця дзейнасці клубнай установы і яе місіі ў грамадстве былі вельмі песімістычныя. Адчуваўся пэўны крызіс у дзейнасці аднаго з некалі запатрабаваных сацыяльных інстытутаў фарміравання асобы ў культурна-дасугавай прасторы. Такім чынам, канцэптуальна-тэарэтычныя, эканамічныя, арганізацыйна-прававыя і кадравыя праблемы, якія назбіраліся ў дадзенай сферы дзейнасці, з’явіліся перадумовай і штуршком для якасных функцыянальна-структурных пераўтварэнняў клубных устаноў.

Па ініцыятыве Міністэрства культуры з сярэдзіны 1990-х гг. пачалася распрацоўка канцэптуальных асноў і праграмных напрамкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці і функцыянавання клубных устаноў. Усебаковае даследаванне гэтых пытанняў ажыццяўлялася ў рамках галіновай праграмы «Шляхі стабілізацыі сеткі дзяржаўных клубных устаноў у новых сацыяльна-эканамічных умовах» (1994–1995), спецыяльнага сацыялагічнага даследавання Беларускага інстытута праблем культуры «Роля сучасных клубных устаноў у забеспячэнні культурных патрэб аўдыторыі» (1995–1996). У гэтыя гады адбываецца працэс пераўтварэння клубных устаноў у дэмакратычны, агульнадаступны, гуманістычна арыентаваны інстытут для ажыццяўлення ў рэгіёнах краіны сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Клубныя ўстановы апынуліся пад уплывам складаных і часам супярэчлівых працэсаў у сферы вольнага часу, сярод якіх вылучаліся: стандартызацыя ладу жыцця і тыражаванне форм аматарскай дзейнасці і мадэлей паводзін; стабілізацыя аўдыторыі мастацтва і мастацкай творчасці; рост патрэб у жывым кантакце з мастацтвам; нарастанне матэрыяльна-прагматычных інтарэсаў насельніцтва, звязаных з пагаршэннем эканамічнага стану грамадства. Акрамя таго, сацыяльна-педагагічныя канцэпцыі таго часу абгрунтоўвалі неабходнасць змены выхаваўчай парадыгмы, якая ў значнай ступені патрабавала пераасэнсавання асноў выхавання, духоўнага станаўлення асобы. Новыя сацыяльныя ідэалы і ўяўленні аб механізмах грамадскага развіцця і выхавання асобы ў непасрэднай дзейнасці сацыяльных інстытутаў звязваліся з духоўнымі каштоўнасцямі традыцыйнай нацыянальнай, рэгіянальнай культуры і менталітэтам беларускага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усё гэта прадвызначала неабходнасць пошуку і ўкаранення новых праектаў і мадэлей устаноў культуры, новых падыходаў да арганізацыі сацыяльна-культурнага жыцця насельніцтва, асабліва на рэгіянальным узроўні.

Новы этап у дзейнасці клубных устаноў пачынаецца на мяжы 1995–1996 гг. і характарызуецца ўдасканаленнем культурнай палітыкі ў галіне народнай творчасці і сацыякультурнай дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Гуманізацыя і рэгіяналізацыя, самакіраванне і ініцыятыва насельніцтва, улік культурна-гістарычных традыцый, дыферэнцыяцыя і інтэграцыя, праблемна-мэтавы характар дзейнасці з'явіліся асноўнымі прынцыпамі, якія накіроўвалі функцыянальна-структурныя пераўтварэнні клубных устаноў.

Нягледзячы на складанасць эканамічных умоў, у дзейнасці ўстаноў сацыякультурнай сферы ў гэты перыяд назіраецца актуалізацыя народнай творчасці, пашыраецца нацыянальна-культурны рух. Клубныя ўстановы канцэнтруюць свае намаганні на вывучэнні і адраджэнні нацыянальных культурных традыцый, мастацкіх промыслаў і рамёстваў, стварэнні ўмоў для самавыяўлення розных этнакультурных суполак.

Пераадолеўшы крызісны перыяд, клубныя ўстановы пачалі выпрацоўваць новы змест і характар дзейнасці, паступова знаходзіць сваё месца ў культурным жыцці краіны.

У 1996–2001 гг. стабілізуецца сетка клубных устаноў сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Гэты працэс функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў Беларусі быў звязаны з іх прафіляваннем, спецыялізацыяй, стварэннем новых мадэлей устаноў культуры ў сферы вольнага часу і ўкараненнем рэгіянальна-мэтавых сацыякультурных праграм. Значна пашырылася інфраструктура сацыякультурнай сферы за кошт новых устаноў культуры ў рэгіёнах: клубаў, палацаў (дамоў, цэнтраў) культуры, цэнтраў (дамоў) народнай творчасці (народнага мастацтва, фальклору), цэнтраў (дамоў) рамёстваў, маладзёжных культурных цэнтраў, цэнтраў нацыянальных культур і інш.

Працэсу стабілізацыі дзейнасці ўстаноў культуры клубнага тыпу ў значнай ступені спрыяла правядзенне Першага рэспубліканскага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (1998), у якім прынялі ўдзел звыш 30 тыс. аматарскіх калектываў розных ведамстваў, што існавалі ў той перыяд пераважна пры клубных установах розных рэгіёнаў Беларусі; рэспубліканскіх акцый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства культуры «Новыя мадэлі ўстаноў культуры ў Беларусі» (1999), «Новыя падыходы да праблем сельскай культуры» (2000) і інш.; рэспубліканскага агляду-конкурсу раённых дамоў культуры і раённых арганізацыйна-метадычных цэнтраў на лепшую арганізацыю культурнага абслугоўвання сельскага насельніцтва (2000); рэспубліканскага агляду-конкурсу абласных навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурна-асветніцкай працы (2001).

У выніку на мяжы стагоддзяў клубныя ўстановы не толькі захавалі жыццяздольнасць, але і спрыялі развіццю культурных ініцыятыў насельніцтва, забяспечылі сацыяльнае рэгуляванне ў галіне народнай творчасці і клубнай работы. Рэалізуючы прыярытэтныя напрамкі галіновай праграмы «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года», клубныя ўстановы краіны галоўную ўвагу звярталі на адраджэнне культурна-гістарычных традыцый, задавальненне культурных патрэб і інтарэсаў грамадзян у сферы вольнага часу, арганізацыю аматарскай мастацкай творчасці і культурнага адпачынку.

На пачатку 2000-х гг. у Беларусі налічвалася каля 350 устаноў новага тыпу, былі адноўлены і дзейнічалі больш за 520 цэнтралізаваных клубных сістэм, значна пашырана сетка новых устаноў, накіраваных на захаванне традыцыйнай культуры (дамы і цэнтры рамёстваў, дамы фальклору, народнай творчасці, народных традыцый і інш.), дзе асноўная ўвага надавалася формам матэрыяльнай і духоўнай культуры. Паводле статыстычных даных, у 2001–2002 гг. у краіне дзейнічалі больш за 50 цэнтраў рамёстваў (з іх 17 сельскіх), 34 дамы фальклору, 40 школ народнай творчасці.

Практыка прафілізацыі клубных устаноў сведчыла, што іх дзейнасць на новым вітку развіцця дазваляла больш уважліва ставіцца да інтарэсаў грамадзян, а таксама рацыянальна выкарыстоўваць існуючыя базу, сродкі, творчыя, інфармацыйныя і іншыя рэсурсы.

Даволі актыўна прафілізацыя дамоў культуры была распачата ў Віцебскай вобласці, дзе была самая вялікая колькасць дамоў рамёстваў – 25. Актыўнай творчай дзейнасцю вызначаліся Лепельскі, Шумілінскі, Гарадоцкі раённыя дамы рамёстваў. Толькі на базе Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору працавала 12 гурткоў традыцыйнага мастацтва, народны клуб самадзейных творцаў «Вытокі», які аб’ядноўваў каля 40 майстроў і мастакоў, было адноўлена каля 20 відаў традыцыйных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод установ культуры Гомельскай вобласці з'явіліся дамы народнай медыцыны, клубы вясковых сустрэч, атрымалі развіццё клубы сацыяльна-культурных паслуг і інш. Прыклады пераўтварэння клубаў у новыя тыпы ўстаноў культуры можна было назіраць на Магілёўшчыне і Гродзеншчыне; стварэння новых устаноў культуры (маладзёжных цэнтраў, цэнтраў культуры і народных традыцый) – у Брэсцкай вобласці. На Міншчыне ў сельскай мясцовасці пачалі працаваць Дом пенсіянераў, Народны дом, Дом фларыстыкі, Дом-майстэрня і інш.

Сярод статыстычных паказчыкаў развіцця сістэмы ўстаноў клубнага тыпу адным з галоўных з'яўлялася колькасць аб'яднанняў аматарскай мастацкай творчасці, бо жыццяздольнасць сучаснага клуба вызначаецца менавіта культурна-творчай і канцэртна-відовішчнай дзейнасцю. З пункту гледжання колькасці і разнастайнасці клубных мерапрыемстваў вырысоўвалася тэндэнцыя іх арыентацыі на рэкрэацыйна-забаўляльную дзейнасць і адпачынак, укараненне розных камерцыйных, дыскатэчных праграм. Клубныя ўстановы паступова набывалі статус аднаго з найбольш актыўных цэнтраў фарміравання рэкрэацыйнай культуры грамадства.

У гэты перыяд катэгорыя работнікаў клубных устаноў паступова становіцца прафесійна ўстойлівай. Тэндэнцыя да скарачэння сеткі ўстаноў у сярэдзіне 1990-х гг. амаль не паўплывала на колькасць занятых у сферы спецыялістаў, а ў некаторых абласцях назіраўся ўстойлівы рост іх колькасці і якасная стабілізацыя кадравага патэнцыялу.

Такім чынам, у перыяд 1991–2011 гг. установы культуры клубнага тыпу накіроўвалі свае намаганні на рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне сацыякультурнай дзейнасці і народнай творчасці. Прыярытэт аддаваўся развіццю і падтрымцы сацыяльна-культурных ініцыятыў насельніцтва, задавальненню культурных патрэб грамадзян у сферы вольнага часу, арганізацыі самадзейнай мастацкай творчасці і культурнага адпачынку.

За 20-гадовы перыяд адбылася змена колькасных паказчыкаў клубных устаноў сістэмы Міністэрства культуры:

| Год | Колькасць клубных устаноў, тыс. |
|---|---|
| 1991 | 4946 |
| 1996 | 4246 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 2001 | 4270 |
| 2006 | 3680 |
| 2010 | 3492 |

Аднак аналіз дзейнасці сучасных клубных устаноў паказвае, што, нягледзячы на значнае скарачэнне іх агульнай колькасці, яны выконваюць сваю сацыяльную ролю ў культурным жыцці краіны: ствараюць неабходныя ўмовы для сацыяльна-культурнай актыўнасці грамадзян, забяспечваюць працэсы захавання, стварэння і распаўсюджвання культурных каштоўнасцей. Сваёй дзейнасцю клубныя ўстановы ў значнай меры спрыяюць развіццю і пашырэнню культурнай сферы вольнага часу.

Сацыяльна-культурная дзейнасць клубных устаноў з’яўляецца састаўной часткай духоўнай культуры грамадства, якая спрыяе яе ўзбагачэнню і дэмакратызацыі, фарміраванню сістэмы вытворчасці і распаўсюджванню мастацка-эстэтычных каштоўнасцей. Адначасова сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта неад’емная частка ўсёй сістэмы грамадскага выхавання, галоўнымі функцыямі якой з’яўляюцца:

– сацыялізацыя, інкультурацыя і індывідуалізацыя асобы;

– прапаганда здаровага ладу жыцця;

– аказанне дапамогі адукацыйным установам ў агульнакультурным і прафесійным асветніцтве;

– садзейнічанне школе і сям’і ў маральна-эстэтычным выхаванні дзяцей і моладзі;

– забеспячэнне працэсу самарэалізацыі творчых патэнцый асобы ў прасторы яе па-за прафесійнага жыцця;

– арганізацыя інтэлектуальна насычанага адпачынку розных катэгорый насельніцтва.

Правядзенне Рэспубліканскага агляду-конкурсу «Клуб года–2011», пацвердзіла, што сваю дзейнасць клубныя ўстановы скіроўваюць галоўным чынам на задавальненне патрэбнасцей насельніцтва ў змястоўным адпачынаку, у набыцці новых ведаў і практычных уменняў, у арганізацыі зносін на аснове агульных інтарэсаў, у індывідуальнай і калектыўнай аматарскай творчасці, у наведванні канцэртна-відовішчных праграм і інш. Арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці клубных устаноў ажыццяўляецца згодна з рэкрэацыйна-забаўляльнымі, пазнавальна-адукацыйнымі, інфармацыйна-камунікатыўнымі, мастацка-творчымі, святочна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відовішчнымі культурнымі патрэбнасцямі як асобы, так і грамадства ўвогуле. Задавальненне гэтых патрэбнасцей з'яўляецца асновай фарміравання тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці, якія будуюцца на спалучэнні гістарычных, этнакультурных традыцый, сацыяльна-псіхалагічных, выхаваўчых падыходаў і сучасных інавацыйных мадэлей грамадскіх паводзін.

Ажыццяўляючы даволі актыўную культурна-займальную работу сярод насельніцтва, мэта якой – адпачынак і рэкрэацыя, гульнявыя зносіны, забаўлянне, аматарская творчасць, адукацыйна-пазнавальная і святочна-відовішчная дзейнасць, клубныя ўстановы запаўняюць вольны час праграмамі і мерапрыемствамі, якія задавальняюць канкрэтных людзей, іх культурныя патрэбнасці і інтарэсы.

Праблемны характар дзейнасці і наяўнасць спецыяльных сацыяльна-рэабілітацыйных, рэкрэацыйных, сацыяльна-псіхалагічных і іншых праграм, дыферэнцыраваных у адпаведнасці з узроставымі, адукацыйнымі, прафесійнымі характарыстыкамі аўдыторыі, выступаюць у якасці галоўнага прафесійнага арыенціра для ўсіх суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасных умовах. Так, на першы план у вырашэнні асноўных задач выходзіць улік сацыяльна-псіхалагічных праблем розных катэгорый насельніцтва. Клубныя ўстановы, як кожны з суб'ектаў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, арыентуюцца на штодзённыя клопаты і праблемы свайго асяроддзя, прапануюць кожнай сацыяльна-дэмаграфічнай, прафесійнай, узроставай групе неабходны «набор» культурных паслуг, пэўныя праграмы, згодна патрэбнасцям і інтарэсам асобы, сацыяльных групп насельніцтва.

XXI ст. адкрывае перад чалавецтвам новыя доступы да інфармацыі і задавальнення культурных, пазнавальных і рэкрэацыйных патрэбнасцей. Зразумела, што без адпаведнага навукова-тэарэтычнага асэнсавання тых з'яў і працэсаў, што адбываюцца ў сацыякультурнай сферы, немагчыма вызначыць асноўныя задачы выхавання і развіцця асобы ў сучасным грамадстве.

Аднак як бы не пашыраліся межы пазнання, як бы не развівалася навукова-тэхнічная база інфармацыі і асветніцтва, сацыяльна-культурная дзейнасць заўсёды будзе выконваць сваю грамадскую місію – рэалізацыю культурастваральнага патэнцыялу кожнага грамадзяніна і культурна-творчае развіццё яго асобы.

Спецыяльныя даследаванні пацвярджаюць неабходнасць больш глыбокага і ўсебаковага асэнсавання ўплыву на сучасны стан

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльна-культурнай дзейнасці з боку як культурна-гістарычных традыцый, так і інавацыйных тэхналогій. Гэта дае магчымасць прасачыць пераемнасць і паслядоўнасць у станаўленні і развіцці розных форм і мадэлей сацыяльных паводзін насельніцтва ў сферы вольнага часу, вылучыць асаблівасці арганізацыі адпачынку, забаўляльнай дзейнасці, аматарскай творчасці, святочнай дзейнасці і г.д.

У сучаснай сацыяльна-культурнай сітуацыі вольны час прадстае як сацыяльна асэнсаваная неабходнасць. Грамадства зацікаўлена ў эфектыўным выкарыстанні свабоднага часу людзей. Гэта неабходна ў мэтах сацыяльна-эканамічнага развіцця і духоўнага станаўлення нашага жыцця ў новых умовах. Менавіта з гэтых пазіцый і фарміруецца спецыяльны сацыяльны заказ на засваенне вольнага часу, на распрацоўку праграм, праектаў і ўвасабленне ў практыку клубных установ розных форм сацыяльна-культурнай дзейнасці насельніцтва. Галоўным застаецца пытанне аб змесце і структуры арганізацыі вольнага часу, бо нельга не пагадзіцца з меркаваннем, што вялікі сацыяльны здабытак, якім для грамадства з'яўляецца вольны час, пры нізкай культуры яго арганізацыі і напоўненасці разнастайнымі відамі і формамі заняткаў пераўтвараецца ў сапраўдную сацыяльную небяспеку.

Неабходнасць сацыяльнага рэгулявання як спецыяльна арганізаванай мэтанакіраванай дзейнасці ў сферы вольнага часу не выклікае сумнення, бо дзейнасць чалавека, сацыяльных груп і г.д. не толькі ва ўмовах вытворчасці, але і ва ўмовах вольнага часу якраз і павінна стаць гэтым спецыфічным тыпам сацыяльнага рэгулявання асобных працэсаў і плыней. Толькі тады яны набудуць неабходны сацыяльна арганізаваны характар, той узровень культуры вольнага часу, што характарызуецца стабільнасцю, рэгулярнасцю, перыядычнасцю, паўтаральнасцю.

У тэарэтычнай мадэлі клубнай установы як сацыяльнага інстытута выхавання асобы абавязкова павінна вызначацца сутнасць сучаснай сацыякультурнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ва ўмовах вольнага часу, адпаведнасць рэчаіснасці ва ўсёй яе эканамічнай, палітычнай і грамадска-культурнай складанасці, наяўнасць агульных арыентыраў і перспектыўных ліній развіцця на будучыню. У канцэнтраваным выглядзе мадэль клубнай установы – гэта сацыяльныя мэты і функцыі культуры ў рэальным стане і дакладных умовах яе развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Відавочна, што павышэнне сацыяльна-выхаваўчай эфектыўнасці дзейнасці клубных устаноў у значнай ступені забяспечваюць арганізацыйна-тэхналагічныя падыходы: каардынацыя – узгадненне, устанаўленне мэтазгодных суадносін паміж усімі суб’ектамі арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці; кансалідацыя – аб’яднанне намаганняў спецыялістаў, розных структурных падраздзяленняў з мэтай павышэння выхаваўчай эфектыўнасці ажыццяўлення культурных праграм; канцэнтрацыя – засяроджванне творчых, кадравых, фінансавых і іншых рэсурсаў і сродкаў на выкананне найбольш важных праграм і прыярытэтных кірункаў сацыяльна-культурнай дзейнасці; комплекснасць – сукупнасць усіх суб’ектаў культурнай дзейнасці, суадноснасць і паслядоўнасць дзеянняў па агульных планах сацыяльна-культурнай работы.

Сучасныя клубныя ўстановы прызначаны больш дзейсна вырашаць важныя сацыяльныя задачы, для чаго неабходна цеснае супрацоўніцтва з органамі адукацыі, сацыяльнай абароны, камітэтамі па справах моладзі, грамадскімі арганізацыямі, творчымі саюзамі і інш. Патрабуецца ўдасканаленне нарматыўнай прававой асновы дзейнасці ўстаноў культуры новых тыпаў і ўмацаванне эканамічнай і матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры ўсіх тыпаў у рэгіёнах Беларусі.

Падаеца, што шляхі і механізмы, вызначаныя Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады, у пэўнай ступені паспрыяюць вырашэнню праблем функцыянавання сучасных устаноў культуры, уключаючы клубныя, галоўнымі кірункамі дзейнасці якіх на сучасным этапе развіцця нашага грамадства з’яўляюцца:

– захаванне і развіццё нацыянальнай культуры, традыцыйных форм сацыякультурнай дзейнасці;

– развіццё аматарскай мастацкай творчасці ва ўсіх яе праяўленнях, раскрыццё і падтрымка творчых індывідуальнасцей і талентаў;

– садзейнічанне пазнавальнай актыўнасці розных груп насельніцтва, самаадукацыі ў галіне літаратуры, мастацтва, гісторыі, навукі, эканомікі, вытворчасці, культуры побыту;

– практычная падтрымка сацыяльна значных творчых ініцыятыў аматарскіх аб’яднанняў, клубаў, грамадскіх суполак; у тым ліку тых, якія спрыяюць развіццю нацыянальных традыцый і нацыянальных культур грамадзян Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– фарміраванне ў розных катэгорый насельніцтва і асобных грамадзян уменняў і навыкаў арганізацыі і самаарганізацыі вольнага часу і адпачынку;

– стварэнне ўмоў для рэалізацыі інтэлектуальна-творчага патэнцыялу і павышэння духоўнасці чалавека;

– садзейнічанне працэсам сацыялізацыі і інкультурацыі асобы сродкамі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Такім чынам, клубная ўстанова ў Беларусі – гэта агульнадаступны, гуманістычна арыентаваны інстытут, які праецыруе ў жыццё сацыяльна-культурныя працэсы ў сферы вольнага часу, надае ім арганізаваны характар і сацыяльна-выхаваўчую скіраванасць.

---


1. *Ариарский, М. А.* Социально-культурная деятельность как предмет научного осмысления / М. А. Ариарский. – СПб. : Арт-студия «Концерт», 2008. – 791 с.

2. Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. – 144 с.

3. *Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. для студэнтаў спец. «культуралогія» устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с.

4. Культура Беларусі : 20 год развіцця (1991–2011) / С. П. Вінакурава [і інш.] ; навук. рэд. І. І. Крук. – Мінск : Ін-т культуры Беларусі, 2012. – 327 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ